УДК 821.161.3-1*П. Панчанка

**В. Ю. Каўцэвіч**
Навуковы кіраўнік – **А. В. Брадзіхіна**,
канд. філал. навук, дацэнт

# ПЕЙЗАЖНА-ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ЛІРЫКА П. ПАНЧАНКІ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ ВОБРАЗА БЕЛАРУСІ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца мастацкія спосабы стварэння вобраза Беларусі ў пейзажнай лірыцы П. Панчанкі. Асаблівая ўвага надаецца апеляцыі пісьменніка да розных органаў пачуцця пры стварэнні вобраза. Аўтар прыходзіць да высновы пра цесную знітаванасць патрыятычнага і публіцыстычнага пачаткаў у пейзажнай лірыцы П. Панчанкі.

**Ключавыя словы:** пейзаж, лірыка, лірычны герой, вобраз, пейзажна-патрыятычная лірыка, экалагічныя матывы.

Пейзажна-патрыятычная лірыка трывала замацавалася ў свядомасці і паэтычным уяўленні Пімена Панчанкі яшчэ на раннім этапе творчасці і стала скразным матывам у яго мастацкай сістэме. Нельга не пагадзіцца з меркаваннем Л. Гарэлік, што «малады паэт ужо на пачатку творчага шляху паказваў сябе ўмелым майстрам лірычнага жывапісу. Яго лірычныя замалёўкі вылучаюцца шматфарбнасцю вясковых краявідаў, шматгалоссем жыцця, поўнай суладнасцю настрою чалавека і прыроды. Ён умеў падслухаць гоман вечаровага лесу, чуйна ўлавіць «хлебны пах зямлі», дакладна ўзнавіць малюнак раз'юшанай навальнічнай стыхіі» [1, с. 4]. Пра важнасць роднай зямлі ў каштоўнаснай сістэме паэта гаворыць яе атаясамліванне з жыццём: *О Радзіма, табою напоўнена сэрца да краю / І заўжды – ці працую, ці пільна на варце стаю, – / Я твой велічны вобраз у думках сваіх уяўляю / І люблю, як жыццё, я зямлю маладую тваю!* [20, с. 31] (верш «Радзіме»). Пра тое ж сведчыць і кніга пад назваю «Зямля ў мяне адна», якая выйшла пасля смерці аўтара, у 1996 годзе.

Нават у цыкле вершаў «Іранскі дзённік» пісьменнік, паказваючы хараство паўднёвай краіны, у снах і думках згадваў вобраз роднай зямлі – *Беларусь… у рамонку і верасе* [2, с. 287], *сасновую хату з пахам свежага хлеба і паранага малака* [2, с. 274]. Лірычны герой П. Панчанкі ўспрымае экзотыку чужой краіны вачыма і душой беларуса, які моцна трымаецца свайго роднага, нацыянальнага свету: *Далёка, ў зялёнай хваёвай старонцы, / Ёсць хата свая ў мяне, пушча і поле, / Сваё найсвятлейшае добрае сонца. / Я іх прамяняць не згаджуся ніколі* [2, с. 271] (верш «Я ўсё пераблытаў…»).

Паэт смела адкрываў непаўторна новае ў акаляючым прыродным свеце, звычайных побытавых з'явах дзякуючы рэдкаму дару мастацкага бачання. Да прыкладу, мог без лішняга напружання намаляваць тую ж летнюю спёку ў сасновым бары не толькі эмацыянальна-пачуццёвымі,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

але і рэалістычнымі фарбамі, карыстаючыся трапнымі мастацкімі дэталямі: *Дыміцца жоўты мох, птушыны спеў замоўк / і млеюць яшчаркі ад смагі…* (верш «Падсочка») [2, с. 52]. П. Панчанка востра адчувае акаляючы свет, пранікнёна апісвае прыроду роднага краю з дапамогай фарбаў, пахаў, гукаў, што з'яўляюцца важнымі элементамі яго мастацкай сістэмы і часта спалучаюцца ў межах аднаго твора. Так, у яго «лірычных карцінах» можна «ўбачыць» і «адчуць» водар жывой прыроды, што надае панчанкаўскай лірыцы асаблівую эстэтычнасць. У вершы «У гасцях» яскрава выяўлены некалькі такіх эфектаў: *Пахне восень бульбаю, / Кмінам і цыбуляю, / Перагрэтай лебядой, / Мутнаватаю вадой /,* або тут жа*: Агуркі крамяныя, / Шлапакі румяныя / Паглядзіш на рыжыкі – / Аж у сэрцы дрыжыкі* [3, с. 72].

П. Панчанка апісвае свой край, найперш выкарыстоўваючы колеры і фарбы: *Пажоўклых клёнаў ціхае святло / скупога сонца роснае дыханне* [3, с. 100]*; Раскідвае зары світальнай медзь / У лужынах барвовыя ільдзінкі* [3, с. 100] (верш «Асеннімі дажджамі заліло…»). У вершы «Пасля апошняй навальніцы» з дапамогай рытмікі і вобразаў пісьменнік перадае шоргат ліста пры падзенні на дарогу:

*А цішыня такая нечуваная*
*Апала на балоты і палі,*
*Што кракне качка ў трысці туманным –*
*За многа вёрст пачуе недзе ліст*
*І ападзе з бляшаным ціхім шкрогатам*
*Наваспаваты брук, на мокрую дарогу там* [4, с. 85].

А. Ярац і В. Ярац слушна заўважылі: «Ствараючы музычны каларыт верша, паэт выкарыстоўвае шэраг разнастайных каларытных камбінацый, вар'іраванне графічнага падзелу сінтагм, рытмарадоў, ужывае прыёмы клаўзульнага паўзавання, рухомасці альбо стабільнасці цэзуры, шматлікія спосабы рыфмоўкі» [5, с. 17]. Пацвердзім развагі даследчыкаў прыкладам: *Сакавік з сакатаннем і сокам / непаўторных вясновых бяроз!* [3, с. 36] (верш «Родная мова»).

У вершах пейзажна-патрыятычнай лірыкі можна не толькі «пачуць» альбо «адчуць водар», але яшчэ і дотыкі, цяпло альбо холад той ці іншай прыроднай з'явы, як, напрыклад, у вершы «Апошні дзень вясны і першы лета»: *І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты, / І ў спёку жыгане цябе зіма* [3, с. 163]. Гэтыя вершы даказваюць вытанчанасць аўтарскага стылю, эстэтычную чуйнасць паэта, абвостранае жаданне паказаць усю шматаблічнасць, шматвобразнасць радзімы, што, бясспрэчна, выклікае асалоду і зачараванасць паэзіяй мастака, прызнае ў ім выбітнага майстра.

Прычым пейзаж у паэта мае нацыянальны характар дзякуючы не толькі характэрным малюнкам роднай прыроды. П. Панчанка падкрэслівае беларускасць пададзеных карцін з дапамогай геаграфічнай канкрэтызацыі (вершы «Ода Талачыну», «Бягомля», «Песня пра Мінск», «Назвы» і інш.) Так, у вершы «Назвы» (1987), які цудоўна характарызуе паэтаву

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

замілаванасць родным, самабытным, ён пералічвае дарагія сэрцу вёскі і мястэчкі. У той жа час мілагучнае вымаўленне кожнай назвы надзвычай яскрава дэманструе прыгажосць і непаўторнасць роднай мовы:

*Залессе, Плёсы, Крэва,*
*Ваўчу і Ваўкавыск*
*Змяніць, закрэсліць трэба! –*
*Здаўна я чую віск.*
*І трубяць зноўку боўдзілы,*
*Што Мсціж, і Арахі,*
*І Бортнікі, і Бондары*
*Здаваць пара ў архіў.*
*Бо назвы ў вас жабрачыя*
*І па-сялянску нудныя:*
*Жабінка, і Жабчыцы,*
*А ёсць яшчэ і горш.*
*Даём вам назвы новыя*
*Пасёлкаў: Ізумрудны,*
*Жамчужны, Лучазарны,*
*І горад Салігорск,*
*І горад Светлагорск.*
*А ў нас паміж лясоў, балот*
*Ніколі гор тых не было* [6, с. 192].

Пейзажна-патрыятычная лірыка П. Панчанкі нярэдка зліваецца з пейзажна-публіцыстычнай, нададаючы ёй экалагічнае гучанне. Паэт выступае ў абарону беларускіх рэк і азёр, ландшафту і фаўны роднага краю, гнеўна выказваецца супраць тых, хто знішчае навакольнае асяроддзе ці абыякава назірае за такімі працэсамі: *Хай рукі адсохнуць у тых, / хто бязлітасна вас высякае* [3, с. 94] (верш «Раўнапраўе дрэў»). Пісьменнік на баку прыроды ў яе супрацьстаянні з чалавекам, пагэтаму асуджае яго. Толькі чалавек нясе адказнасць за тое, што адбываецца на зямлі. Любое парушэнне раўнавагі ў свеце можа прывесці да вялікіх страт: *Вінаваты ў гэтым не сарматы, Вінаваты ўсе мы: ты і я* [6, с. 172].

Ствараючы вобраз Беларусі, П. Панчанка звяртаецца і да нацыянальнай экалагічнай бяды – Чарнобыльскай катастрофы. Верш «Аб самым смачным» выглядае сведчаннем гэтых горкіх перажыванняў:

*Які Дэга?*
*Тут пахне Хірасімай.*
*Няма слядоў бусліных*
*І ласіных: Над Прыпяццю –*
*Нябачнай смерці след.*
*Палескі край,*
*Як пазмрачнеў твой свет* [6, с. 193].

У вершы шмат слоў-сімвалаў, што характарызуюць Беларусь, яе першародную чысціню: белы колер буслоў; паўнаводная Прыпяць;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

багатае на прыродныя дары, сваю непаўторную прыроду, з адметнай мовай і культурай Палессе; жабінае кваканне, жаўруковыя песні – знакі чысціні прыроды. Усё гэта супрацьпастаўляецца жахліваму становішчу, у якім апынулася прырода Беларусі пасля Чарнобыльскай аварыі – усюды «цьмяна, дымна, чорна», пах Херасімы, «смерці след». У вершы «Раўнавага» і «Чорныя дзіркі» П. Панчанка паказвае Чарнобыль як злавесную сілу, перад чытачом паўстае карціна, поўная трагізму. Маналог героя П. Панчанкі поўны горычы і безвыходнасці.

Другі варыянт зліцця патрыятычнага і публіцыстычнага пачаткаў у пейзажнай лірыцы – вобраз скалечанай Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Гэта плач па пакінутым родным краі, сатканы ў свядомасці ваяра з многіх дэталей: абрысаў ніў і гаёў, птушак і клёнаў, жытоў і агнёў зарніц, калючага іржышча і камянёў, сонца, матчынага хлеба і, нарэшце, гаючай *вады з прыдарожнага ручая*, што была *саладзей за мёд нам* [2, с. 139]. Праблемна-мастацкі аналіз пейзажна-патрыятычнай лірыкі пісьменніка ваеннага часу дазваляе гаварыць пра пра яе сугучча з усёй тагачаснай еўрапейскай літаратурай гуманістычнага характару.

Такім чынам, у пейзажна-патрыятычнай лірыцы П. Панчанка карпатліва ствараў вобраз Беларусі, нават у вершах, прысвечаных экзатычным краінам (да прыкладу, у цыкле «Іранскі дзённік»). Пейзаж у паэта заўсёды мае выразнае нацыянальнае аблічча, ён пазнавальны як за кошт дакладных маляўнічых карцін прыроды, створаных як з дапамогай зрокавых, слыхавых, пахавых і дотыкавых эфектаў, так і праз прыём геаграфічнай канкрэтызацыі. Пейзажна-патрыятычная лірыка П. Панчанкі нярэдка зліваецца з пейзажна-публіцыстычнай, актуалізуючы экалагічныя і антываенныя матывы, што надае такім вершам перасцерагальны характар. Вялікая адданасць роднай зямлі, усёахопная любоў да Беларусі выступае лейтматывам багатай па выкарыстанні мастацкіх форм пейзажна-патрыятычнай лірыкі П. Панчанкі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Гарэлік, Л. М. Далучаны да вечнасці: новае прачытанне лірыкі П. Панчанкі / Л. М. Гарэлік // Беларус. мова і літ. – 1997. – № 9. – С. 3–14.

2. Панчанка, П. Збор твораў : у 4 т. Том 1: Вершы і паэмы (1934–1945 гг.) / П. Панчанка. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 366 с.

3. Панчанка, П. Збор твораў : у 4 т. Том 3: Вершы 1963–1981 гг. / П. Панчанка. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 351 с.

4. Панчанка, П. Збор твораў : у 4 т. Том 2: Вершы і паэмы (1934–1945 гг.) / П. Панчанка. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 414 с.

5. Ярац, А. Шматгалосы свет паэзіі Пімена Панчанкі / А. Ярац, В. Ярац // Роднае слова. – 2017. – № 8. – С. 14–17.

6. Панчанка, П. Мы з тых беларусаў…: вершы і паэма / П. Панчанка. – Мінск : Юнацтва, 1990. – 206 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Abstract.** The article examines the artistic ways to create the image of Belarus in the landscape lyrics P. Panchenko. Particular attention is paid to the writer's appeal to different senses to create an image. The author comes to the conclusion of a close connection patriotic and journalistic started in the landscape lyrics P. Panchenko.
**Keywords**: landscape, lyrics, lyrical hero, image, landscape-patriotic lyrics, environmental motifs.

УДК 821.161.1-14

**А. И. Копнинова**
Научный руководитель – **Е. Л. Гречаникова**,
старший преподаватель

# СПЕЦИФИКА ХУДОЖЕСТВЕННОГО МИРА ПОЭТИЧЕСКОГО ЦИКЛА ИОСИФА БРОДСКОГО «20 СОНЕТОВ К МАРИИ СТЮАРТ»

**Аннотация.** В статье исследуется ряд средств художественной выразительности, в том числе стилистических фигур, и элементов художественного мира поэтического цикла И. Бродского «20 сонетов к Марии Стюарт», определяющих интертекстуальный характер названного произведения.
**Ключевые слова:** Бродский, сонет, специфика, лирический герой, Советский Союз, Мария Стюарт, многоплановость образов, ирония, интертекстуальность.

На фабульном уровне «20 сонетов к Марии Стюарт» Иосифа Бродского – это история о том, как лирический герой гуляет в Люксембургском саду в Париже и встречает там памятник ***Марии Стюарт***. Данная встреча становится причиной диалога лирического героя со статуей. Бродский неоднократно использовал подобный приём обращения к предполагаемому собеседнику: в «Письмах к римскому другу» (***Говоришь***, *что все наместники – ворюги?* [1]); в «Развивая Платона» (*Я хотел бы жить,* ***Фортунатус***, *в городе, где река…* [2]); в «Одиссей Телемаку» (***Мой Телемак***, *Троянская война окончена. Кто победил – не помню* [3]).

Беседа русского поэта-маргинала и шотландской Королевы – беседа двух эмигрантов: Марии Стюарт пришлось бежать из Шотландии после Битвы при Лангсайде в 1568 году, И. Бродский на момент создания «20 сонетов» (1974 год) уже покинул Советский Союз. Доверительный и одновременно ироничный тон – характерная черта всего цикла.

Лирический герой на протяжении цикла многократно обращается к казнённой королеве Шотландии Марии Стюарт (10 раз). Однако стоит заметить, что обращение к историческому персонажу Марии Стюарт условно, поскольку образ многоплановый, разноуровневый, содержит

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ